УДК 340

# СТУДЭНТЫ, ВЫКЛАДЧЫКІ, ВЫПУСКНІКІ МІНСКАГА ЮРЫДЫЧНАГА ІНСТЫТУТА – УДЗЕЛЬНІКІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (да 80-годдзя Вялікай Перамогі)

***А. В. ШЫДЛОЎСКІ***[1*], ***Л. Л. ГОЛУБЕВА***[1*], ***Т. І. ДОЎНАР***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Вызначаецца ўнёсак студэнтаў, выкладчыкаў, выпускнікоў Мінскага юрыдычнага інстытута ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і атрыманне Вялікай Перамогі. Паказваецца ключавая роля вядомых вучоных – дактароў юрыдычных навук, прафесараў юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, у станаўленні і развіцці юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі.

***Ключавыя словы***: Мінскі юрыдычны інстытут; юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны; дактары юрыдычных навук; прафесары.

**Образец цитирования:**
Шыдлоўскі АВ, Голубева ЛЛ, Доўнар ТІ. Студэнты, выкладчыкі, выпускнікі Мінскага юрыдычнага інстытута – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны (да 80-годдзя Вялікай Перамогі). *Журнал Белорусского государственного университета. Право*. 2025;2:6–15.
EDN: OTCPEX

**For citation:**
Shidlovsky AV, Golubeva LL, Dovnar TI. Students, lecturers, graduates of the Minsk Law Institute – participants of the Great Patriotic War (to the 80th anniversary of Great Victory). *Journal of the Belarusian State University. Law*. 2025;2:6–15.
Belarusian.
EDN: OTCPEX

**Авторы:**
***Андрей Викторович Шидловский*** – кандидат юридических наук, доцент; декан юридического факультета.
***Людмила Леонидовна Голубева*** – кандидат юридических наук, доцент; заведующий кафедрой теории и истории государства и права юридического факультета.
***Таисия Ивановна Довнар*** – доктор юридических наук, профессор; профессор кафедры теории и истории государства и права юридического факультета.

**Authors:**
***Andrey V. Shidlovsky***, PhD (law), docent; dean of the faculty of law.
*shidlovsky@bsu.by*
***Lyudmila L. Golubeva***, PhD (law), docent; head of the department of theory and history of state and law, faculty of law.
*golubevaLL@bsu.by*
***Taisiya I. Dovnar***, doctor of science (law), full professor; professor at the department of theory and history of state and law, faculty of law.
*dovnarti@bsu.by*

# СТУДЕНТЫ, ПРЕПОДАВАТЕЛИ, ВЫПУСКНИКИ МИНСКОГО ЮРИДИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА – УЧАСТНИКИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ (к 80-летию Великой Победы)

***А. В. ШИДЛОВСКИЙ***[1)]***, Л. Л. ГОЛУБЕВА***[1)]***, Т. И. ДОВНАР***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Определяется вклад студентов, преподавателей, выпускников Минского юридического института в борьбу с немецко-фашистскими захватчиками и одержание Великой Победы. Показывается ключевая роль известных ученых – докторов юридических наук, профессоров юридического факультета Белорусского государственного университета, которые участвовали в Великой Отечественной войне, в становлении и развитии юридической науки и образования Беларуси.

***Ключевые слова:*** Минский юридический институт; юридический факультет Белорусского государственного университета; участники Великой Отечественной войны; доктора юридических наук; профессора.

# STUDENTS, LECTURERS, GRADUATES OF THE MINSK LAW INSTITUTE – PARTICIPANTS OF THE GREAT PATRIOTIC WAR (to the 80th anniversary of Great Victory)

***A. V. SHIDLOVSKY***[a]***, L. L. GOLUBEVA***[a]***, T. I. DOVNAR***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*
*Corresponding author: L. L. Golubeva (golubevaLL@bsu.by)*

***Abstract.*** The article is devoted to the study of the contribution of students, graduates, and lecturers of the Minsk Law Institute to the fight against the nazi invaders and to achieving the Great Victory. The article shows the key role of famous doctors of law, professors of the faculty of law of the Belarusian State University, participants of the Great Patriotic War in the formation and development of legal science and education in Belarus.

***Keywords:*** Minsk Law Institute; faculty of law of the Belarusian State University; participants of the Great Patriotic War; doctors of law; professors.

## Уводзіны

Згодна з арт. 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь «дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Менавіта 9 мая, 22 чэрвеня і 3 ліпеня па ўсёй краіне шануюць памяць нашых суайчыннікаў, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод іх ахвяры і баявых дзеянняў, і страшнага генацыду. Мы абавязаны помніць подзвіг народа, здзейснены ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ушаноўваць памяць тых, хто прайшоў слаўны баявы шлях і набліжаў Вялікую Перамогу, выхоўваць у моладзі павагу да гераізму беларускага народа ў гады вайны на прыкладзе подзвігу дзядоў і бацькоў, студэнтаў, выпускнікоў, выкладчыкаў Мінскага юрыдычнага інстытута (МЮІ). У Вялікай Айчыннай вайне вырашаўся лёс нашай краіны, будучыня сусветнай цывілізацыі, прагрэсу і дэмакратыі. Гэта вайна была агульнанароднай вайной савецкага народа за свабоду і незалежнасць.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны студэнты, выпускнікі, выкладчыкі МЮІ актыўна ўключыліся ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Некаторыя з іх, застаўшыся на акупіраванай тэрыторыі, змагаліся з ворагам у падпольных арганізацыях і партызанскіх атрадах, іншыя ваявалі на фронце.

На юрыдычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 5 мая 1986 г. быў адкрыты музей [1, с. 4], на адным са стэндаў якога змешчаны надпіс «Они сражались в действующей армии. В институт не вернулись». Гэты стэнд расказвае аб студэнтах МЮІ, што пайшлі на фронт і аддалі жыццё за Радзіму. Другі стэнд носіць назву «Огненный выпуск». У гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі многія студэнты, выпускнікі, выкладчыкі МЮІ. Сёння іх прозвішчамі названы вуліцы сталіцы і іншых гарадоў і пасёлкаў рэспублікі.

Праца Л. П. Максімавай «Юридический факультет Белорусского государственного университета: история и современность» была выдадзена ў 1998 г. [2]. У кнізе даследуюцца этапы станаўлення і развіцця

юрыдычнага факультэта БДУ, звяртаецца ўвага на гераічны подзвіг студэнтаў, выпускнікоў, выкладчыкаў МЮІ ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Кніга Л. П. Максімавай «Огненный выпуск. Факты. Документы» была надрукавана ў 2010 г. [1]. Выданне прысвечана студэнтам, выпускнікам, выкладчыкам МЮІ, іх гераічнай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі акупіраванай Беларусі.

Аднак, на жаль, на сённяшні дзень не існуе змястоўнай навуковай працы пра подзвіг студэнтаў, выкладчыкаў, выпускнікоў МЮІ і юрыдычнага факультэта БДУ ў Вялікай Айчыннай вайне, дзе былі б падрабязна прааналізаваны жыццё і праца былых удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё юрыдычнага факультэта, універсітэцкай юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі. Многія з гэтых людзей з'яўляюцца вядомымі вучонымі. Яны сталі заснавальнікамі юрыдычных навуковых школ, а іх дзейнасць сёння паспяхова працягваюць нашчадкі.

## Асноўная частка

У 1941 г. Вялікая Айчынная вайна прыпыніла дзейнасць МЮІ [3, с. 58]. Дзяржаўныя экзамены, нягледзячы на пачатак вайны, былі праведзены, і ўсе студэнты паспяхова скончылі навучанне. Дакументы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі засталіся ў інстытуце. Даведка пра тое, што экзамены завяршыліся, была заверана дырэктарам інстытута А. М. Штэйнгартам [1, с. 11–13].

Студэнты і выкладчыкі інстытута (у тым ліку дырэктар А. М. Штэйнгарт, намеснік дырэктара М. А. Гельфер, прафесар С. М. Гофман, загадчык кафедры судовага права В. Г. Гінсбург, выкладчык крыміналістыкі М. С. Штэйнгауз, выкладчык асноў бухгалтарскага ўліку Б. С. Шчаглоў, выкладчык палітэканоміі А. П. Скуман, кіраўнік семінара па крымінальным праве В. К. Пракудовіч, дацэнты М. Ц. Баран, П. Е. Рубанчык, Б. Я. Бабіцкі, Л. А. Рудзіцкі і інш.) 22 чэрвеня 1941 г. выйшлі на мітынг. Яны заявілі пра сваю гатоўнасць аддаць усе сілы ў барацьбе з ворагам, а калі спатрэбіцца, то і жыццё [1, с. 9–10].

У першыя дні вайны вучэбны корпус інстытута быў спалены. Бібліятэку і вучэбнае абсталяванне МЮІ вывезлі ў Германію, студэнцкія інтэрнаты і жылыя дамы навуковых супрацоўнікаў разбурылі.

Многія студэнты, выпускнікі і выкладчыкі з самага пачатку ўключыліся ў барацьбу з захопнікамі. У Мінску і яго прыгарадах дзейнічала больш за 50 падпольных груп і арганізацый. У ліпені – жніўні 1941 г. у сталіцы пачала дзейнічаць падпольная патрыятычная антыфашысцкая група выкладчыкаў і студэнтаў МЮІ «Группа преподавателей и студентов юридического института» [1, с. 25–26] пад кіраўніцтвам яго выпускніцы, асістэнта кафедры марксізма-ленінізма М. Б. Осіпавай (1909–1999). Явачнай кватэрай быў студэнцкі інтэрнат (вул. Заслаўская, 33) [4, с. 27], куды часта прыходзілі партызаны і члены іншых падпольных груп і арганізацый, што дзейнічалі ў Мінску і прыгарадах. Спачатку ў склад падпольнай групы ўваходзілі 7 чалавек, пазней – 26. Удзельнікамі групы былі выкладчыкі М. Ф. Малаковіч, А. А. Сакалова, І. Г. Некрашэвіч, Н. Н. Крэчатовіч, студэнты Р. Бромберг, М. Столаў, Г. Ліпская, Ф. Злоткіна. М. Б. Осіпава з'яўлялася сувязной партызанскіх атрадаў М. М. Нікіціна, Дзімы, атрада «Мясцовыя», брыгады дзядзі Колі.

Гаўляйтар В. Кубэ – нацысцкі генеральны камісар у акупіраванай Беларусі – быў забіты 22 верасня 1943 г. у выніку выбуху міны, якую М. Б. Осіпава перадала Е. Г. Мазанік. 29 кастрычніка 1943 г. М. Б. Осіпавай было прысуджана званне Героя Савецкага Саюза. Марыя Барысаўна ўзнагароджана ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, шматлікімі медалямі.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны М. Б. Осіпава была дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1947–1963), членам Вярхоўнага Суда БССР, Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму камітэту абароны міру. М. Б. Осіпава стала ганаровым грамадзянінам Мінска і Нурэка (Таджыкістан).

Выпускніца факультэта права і гаспадаркі БДУ (1927), кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу МЮІ (адначасова работнік абласной пракуратуры) А. А. Сакалова (1906–1942), якая з'яўлялася членам падпольнай групы М. Б. Осіпавай, была замучана фашыстамі ў турме і расстраляна. 17 красавіка 1942 г. быў смяротна паранены кіраўнік падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі, студэнт 3-га курса МЮІ В. С. Жудро (1917–1942), 20 красавіка ён памер. В. С. Жудро пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

Студэнты і выпускнікі МЮІ з першых дзён вайны актыўна змагаліся з ворагам. Сярод іх палітрук А. Д. Азарноў (1917–1942), кіраўнік падпольнай маладзёжнай групы ў вёсцы Навінкі Слуцкага раёна Мінскай вобласці, сувязная партызанскага атрада Н. М. Акуліч (1914–1942), член падпольнай арганізацыі М. Б. Осіпавай, кіраўнік падпольнай групы Р. М. Бромберг (1916–?), ваенны следчы ваеннай пракуратуры ваенна-марской базы, памочнік ваеннага пракурора флота А. П. Вяроўкін (1921–?), удзельнік бабруйскага падполля і партызанскага руху С. С. Гарковіч (1915–1944), намеснік камандзіра партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава П. В. Дудкоўскі (1917–1997), палітработнік Б. З. Каган (1919–1941), партызан яўрэйскага партызанскага атрада № 106 А. Я. Ленчнер (1923–?), кіраўнік падпольнай камсамольскай маладзёжнай арганізацыі ў в. Казімірава Ф. Д. Максімаў (1921–1942), ваенны следчы пракуратуры 417-й стралковай дывізіі М. П. Мельнік (1919–1943),

следчы ваеннай пракуратуры Э. З. Мінін (1920–1942), член падпольнай камсамольскай арганізацыі «Адам» і падпольнай арганізацыі М. Б. Осіпавай Г. Ц. Песнякевіч (1919–1976), партызан атрада імя М. І. Кутузава 1-й брыгады імя К. С. Заслонава А. П. Пузырны (1921–1944), член антыфашысцкай падпольнай арганізацыі ў Магілёве, партызан палка К. М. Белаусава Д. А. Рэпін (1914–1942), член падпольнай арганізацыі М. Б. Осіпавай, партызан атрада М. М. Нікіціна М. Э. Столаў (1922–1942), разведчык, радыст, старшы сяржант 6-га танкавага корпуса А. А. Тарлер (1921–2003), следчы ваеннай пракуратуры С. Л. Прасаловіч, намеснік камандзіра партызанскага атрада «25 лет Октября» па разведцы і контрразведцы В. П. Сахараў, А. М. Фралоў (1921–1943), М. І. Эпштэйн (1917–1943), А. А. Янушкевіч (1918–1941), К. П. Ярмоленка (1945–1972), В. І. Бугаеў (1915–1943), У. Ф. Дашкоўскі (1916–1944), М. В. Марцючэнка (1917–1943), Л. І. Мітрафанаў (1921–1941), У. І. Срэценскі (1916–1942), Б. А. Плоткін, У. З. Смарчак і інш.

Выкладчыкі МЮІ, з першых дзён вайны застаўшыся на акупіраванай тэрыторыі, змагаліся з ворагам у падпольных арганізацыях, партызанскіх атрадах, ваявалі на фронце. Сярод іх загадчык кафедры палітэканоміі МЮІ, намеснік дырэктара МЮІ, дацэнт М. Ц. Баран (1898–1972), загадчык кафедры гісторыі партыі МЮІ Г. М. Гейфман (1906–1945), выкладчык МЮІ М. К. Каржанеўскі (1904–1943), выкладчык МЮІ М. Ф. Малаковіч (1903–1943), дацэнт МЮІ П. Я. Рубінчык (1904–?) і інш.

Многія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны пасля яе заканчэння займалі высокія дзяржаўныя пасады. Так, А. Г. Бондар, выпускнік МЮІ 1935 г., з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся членам падпольнага абкама КП(б)Б і намеснікам камандзіра Мінскага партызанскага злучэння па разведцы Мінскай, Палескай і Бабруйскай абласцей. У лютым 1944 г. ён быў адкліканы з фронту і прызначаны Старшынёй Вярхоўнага Суда БССР. У 1945 г. А. Г. Бондар быў абраны сакратаром Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Па сумяшчальніцтву ў 1945–1948 гг. ён працаваў загадчыкам кафедры крымінальнага права МЮІ[1]. У 1949–1967 гг. А. Г. Бондар працаваў пракурорам БССР, з 1967 па 1984 г. – Старшынёй Вярхоўнага Суда БССР. Неаднаразова ён абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (1950, 1954, 1958), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1947, 1951, 1963, 1967). А. Г. Бондар узнагароджаны ордэнамі Леніна (1949), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1974), Чырвонага Сцяга (1943), Дружбы народаў (1978), Чырвонай Зоркі (1942), двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1945, 1967) і шматлікімі медалямі, мае званне заслужанага юрыста БССР (1968).

Выпускнік МЮІ 1941 г. П. В. Дудкоўскі працаваў намеснікам, першым намеснікам пракурора БССР і адначасова з'яўляўся начальнікам следчага ўпраўлення ў 1962–1964 гг. А. Я. Ленчнер пасля вайны 36 гадоў працаваў у Мінскай абласной калегіі адвакатаў. Г. Ц. Песнякевіч пасля вайны быў юрысконсультам у Белкаапсаюзе. В. П. Сахараў займаў пасаду пракурора Гродзенскай вобласці да мая 1969 г. А. А. Тарлер працаваў адвакатам Полацкай юрыдычнай кансультацыі.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Г. А. Цярахаў (скончыў МЮІ ў 1933 г.) выконваў абавязкі Галоўнага транспартнага пракурора, працаваў начальнікам па наглядзе за следствам у органах Камітэта дзяржаўнай бяспекі Пракуратуры СССР. Ён уваходзіў у склад следчай групы пракуратуры СССР па справе Л. Берыі і яго супольнікаў (1954). Г. А. Цярахаву прысуджаны званні заслужанага юрыста РСФСР (1976) і ганаровага работніка пракуратуры (1982).

Яшчэ адзін выпускнік МЮІ, К. П. Ярмоленка, служыў у органах ваеннай пракуратуры Узброеных Сіл СССР, займаў пасаду ваеннага пракурора Архангельскага гарнізона.

Пастанова СНК БССР № 594 «Аб узнаўленні дзейнасці Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута ў г. Мінску» была прынята 20 верасня 1944 г.[2] 11 снежня 1944 г. ва ўстанове пачаліся заняткі. Згодна з загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР ад 7 кастрычніка 1954 г. № 1048 «О реорганизации Минского юридического института в юридический факультет Белорусского государственного университета» МЮІ быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт БДУ.

Пасля заканчэння вайны некаторыя былыя франтавікі сталі студэнтамі юрыдычнага факультэта БДУ, працягнулі навучанне ў аспірантуры або адразу сталі выкладчыкамі на факультэце. Многія з іх абаранілі кандыдацкія, доктарскія дысертацыі, сталі заснавальнікамі юрыдычных навуковых школ Беларусі. У гэтым кантэксце варта згадаць наступныя імёны: Я. П. Андрэеў (1924–2003), С. П. Бякешка (1923–2001), Г. А. Варабей (1934–2012), А. А. Галаўко (1925–2014), І. І. Гарэлік (1921–2008), М. М. Гапановіч (1919–1979), В. А. Дарогін (1912–1995), С. Р. Драбязка (1922–2019), А. В. Дулаў (1924–2018), К. В. Кічыгіна (1923–2002), С. В. Курылёў (1919–1968), А. Ц. Лейзераў (1922–2007), І. А. Матусевіч (1927–2000), Я. А. Мацвіенка (1925–1998), Г. А. Павецьеў (1909–1971), Я. Ф. Плюта (1902–1988), В. К. Пракудовіч, В. Л. Пруднічэнка (1923–?), Л. А. Рудзіцкі (1901–1953), Я. М. Тагуноў (1925–2012), І. С. Цішкевіч (1919–2001), В. Ф. Чыгір (1924–2024), В. С. Швяцоў (1919–1988), В. А. Шкурко (1919–1998), М. Р. Юркевіч (1928–2017), І. А. Юхо (1921–2004) [5, с. 194–204] і інш.

У 2011 г. выйшла ў свет кніга «Профессора, наденьте ордена!» [6]. Выданне прысвечана ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, прафесарам, дактарам

[1]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 1110. Воп. 1. Спр. 18.
[2]Там жа. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1.

навук А. А. Галаўко, С. Р. Драбязка, А. В. Дулаву, В. Ф. Чыгіру, М. Р. Юркевічу, якія ў той час яшчэ працавалі на юрыдычным факультэце БДУ і былі заснавальнікамі прававых школ у айчыннай юрыдычнай навуцы. Згаданыя навукоўцы ўваходзілі ў залаты фонд кадраў факультэта і ўніверсітэта.

Грунтоўныя даследаванні станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці праводзіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны І. А. Юхо. Іосіфа Аляксандравіча прызвалі ў армію ўжо ў 1939 г. Ён прайшоў усю вайну, некалькі разоў быў паранены. І. А. Юхо ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Іосіф Аляксандравіч скончыў МЮІ ў 1949 г. Ён падрыхтаваў і ў 1963 г. упершыню на юрыдычным факультэце пачаў чытаць курс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. І. А. Юхо працаваў народным суддзёй, малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, намеснікам старшыні юрыдычнай камісіі пры Савеце Міністраў БССР, дацэнтам кафедры грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага права, загадчыкам кафедры гісторыі дзяржавы і права, прафесарам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, намеснікам дэкана юрыдычнага факультэта БДУ.

Іосіф Аляксандравіч быў выдатным педагогам, які любіў выкладчыцкую працу. Ён выхаваў не адно пакаленне студэнтаў. Навуковец звяртаў увагу на прычыны замоўчвання і фальсіфікацыі ў мінулым беларускай гісторыі, тлумачыў, чаму ў айчыннай гісторыка-прававой навуцы ўзніклі белыя плямы, даказваў неабходнасць актывізаваць навуковыя даследаванні па многіх пытаннях айчыннай гісторыі дзяржавы і права і г. д. І. А. Юхо ўдзельнічаў у распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.

Іосіф Аляксандравіч абараніў доктарскую дысертацыю «Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў XVI ст.» у 1980 г., у 1981 г. ён атрымаў навуковае званне прафесара. І. А. Юхо з’яўляецца аўтарам звыш 200 навуковых прац. Яго шматлікімі вучэбнымі дапаможнікамі («Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі» (1992), «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (2000, 2004) і інш.) да гэтага часу карыстаюцца студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі Беларусі. Асаблівая важнасць навукова-творчай дзейнасці І. А. Юхо заключаецца ў тым, што яго ідэі былі і зараз з’яўляюцца падставай для правядзення далейшых даследаванняў [7, с. 260–261]. Пад кіраўніцтвам Іосіфа Аляксандравіча абаронены 2 доктарскія і 10 кандыдацкіх дысертацый. Прафесар заснаваў навуковую школу «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», якой кіраваў на працягу 40 гадоў.

Побач з І. А. Юхо шмат гадоў на кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права працаваў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны С. Р. Драбязка. Сцяпан Рыгоравіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені і многімі медалямі. Пасля заканчэння МЮІ ў 1949 г. ён пачаў працаваць у гэтай установе. У 1973–1974 гг. С. Р. Драбязка займаў пасаду загадчыка кафедры тэорыі дзяржавы і права, у 1974–1988 гг. – загадчыка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Сцяпан Рыгоравіч абараніў доктарскую дысертацыю «Эфектыўнасць заканадаўства ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы грамадства» ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце ў 1969 г. Навуковае званне прафесара ён атрымаў у 1971 г. С. Р. Драбязка з’яўляецца аўтарам звыш 250 навуковых прац, у тым ліку 7 манаграфій, 3 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 2009 г. быў надрукаваны падручнік «Общая теория права», у стварэнні якога ўдзельнічаў Сцяпан Рыгоравіч. Ён падрыхтаваў 1 доктара і 6 кандыдатаў юрыдычных навук. С. Р. Драбязка з’яўляецца заслужаным юрыстам Рэспублікі Беларусь. У 1972 г. прафесар заснаваў навуковую школу «Концептуально-теоретические закономерности развития и функционирования государства и права, правовое законодательство и закономерности его совершенствования» і кіраваў ёй у 1972–1989 гг., а таксама ў 2008–2019 гг.

У працах С. Р. Драбязкі надавалася шмат увагі ўдасканаленню дзяржаўнага апарата і права, забеспячэнню суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і іншым тэмам. Сцяпан Рыгоравіч удзельнічаў у распрацоўцы праектаў Канстытуцыі СССР 1977 г., Канстытуцыі БССР 1978 г., Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., з’яўляўся старшынёй Дзяржаўнага экспертнага савета па сацыяльна-эканамічных праблемах і праблемах развіцця дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь, членам Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны В. А. Дарогін узнагароджаны ордэнамі і медалямі. У 1933 г. ён скончыў Ленінградскі юрыдычны інстытут. У 1947–1954 гг. Васіль Аляксандравіч працаваў намеснікам дырэктара МЮІ па навуковай і вучэбнай рабоце, у 1954–1972 гг. – загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ, у 1959–1964 гг. – дэканам юрыдычнага факультэта БДУ. В. А. Дарогін – аўтар звыш 50 навуковых прац.

Значны ўнёсак у развіццё навукі канстытуцыйнага і адміністрацыйнага права зрабілі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны А. А. Галаўко, А. Ц. Лейзераў, Я. М. Тагуноў і Г. А. Варабей. Яны закладалі асновы навуковай школы канстытуцыйнага права, праводзілі навуковыя даследаванні канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, фінансавага заканадаўства Беларусі, сістэмы дзяржаўнай улады, мясцовага кіравання і самакіравання, узаемаадносін дзяржавы і асобы, прававога статусу грамадзяніна і інш. Іх навуковыя ідэі выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы важнейшых нарматыўных прававых актаў, у тым ліку канстытуцый і кодэксаў.

А. А. Галаўко ўзнагароджаны трыма баявымі ордэнамі, у тым ліку ордэнам за вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Ён прымаў удзел у Парадзе Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г. Анатоль Аляксандравіч скончыў Харкаўскі юрыдычны інстытут у 1950 г. У 1954–1959 гг. ён працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, у 1959–1965 гг. – дацэнтам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, у 1965–1990 гг. – загадчыкам кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, у 1990–2012 гг. – прафесарам кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ [6]. У 1973 г. А. А. Галаўко абараніў доктарскую дысертацыю «Арганізацыйна-прававыя праблемы ў дзейнасці Саветаў па кіраўніцтву калгасным будаўніцтвам». Навуковае званне прафесара ён атрымаў у 1974 г. Анатоль Аляксандравіч падрыхтаваў 35 кандыдатаў юрыдычных навук (9 з іх з’яўляюцца грамадзянамі замежных краін) і 8 дактароў юрыдычных навук. А. А. Галаўко – аўтар каля 400 навуковых прац, многія з якіх з’яўляюцца дастаткова вядомымі (манаграфіі «Человек, личность, гражданин» (1982), «Теоретические основы демократии» (2003) і інш.). З яго ўдзелам былі выдадзены падручнікі «Советское строительство» (1979), «Административное право Республики Беларусь» (1997) і інш. Анатоль Аляксандравіч быў членам двух спецыялізаваных саветаў па абароне дысертацый, узначальваў Навукова-кансультатыўны савет пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, прымаў удзел у рабочых групах па падрыхтоўцы праектаў Канстытуцыі СССР 1977 г., Канстытуцыі БССР 1978 г., Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. А. А. Галаўко – заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны А. Ц. Лейзераў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. У 1963–1977 гг. ён займаў пасаду дацэнта, у 1988–2005 гг. – прафесара кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ. А. Ц. Лейзераў з’яўляўся членам Камісіі па распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (1993–1994 гг.), членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь. Аркадзь Цевелевіч абараніў доктарскую дысертацыю «Тэарэтычныя праблемы ўдасканалення дэмакратычных пачаткаў у фарміраванні і дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў (сацыяльна-прававы аспект)» у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце ў 1988 г. Навуковае званне прафесара ён атрымаў у 1990 г. А. Ц. Лейзераў з’яўляецца аўтарам каля 300 навуковых прац.

Удзельнік вялікай Айчыннай вайны Я. М. Тагуноў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. У 1966–1997 гг. ён займаў пасаду дацэнта кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ. У 1953 г. Я. М. Тагуноў абараніў кандыдацкую дысертацыю «Пракурорскі нагляд за захаваннем сацыялістычнай законнасці ў дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных» у Маскоўскім юрыдычным інстытуце. Ён з’яўляецца аўтарам 80 навуковых прац.

Доўгі час на кафедры канстытуцыйнага права працаваў Г. А. Варабей, якому ў 1941 г., калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, не споўнілася яшчэ і 7 гадоў. У 1944–1945 гг. ён быў сынам палка, выхаванцам музычнага ўзвода 51-га стралковага запаснога палка. У 1965 г. Г. А. Варабей скончыў юрыдычны факультэт БДУ. У 1971–1988 гг. ён працаваў дацэнтам, намеснікам дэкана юрыдычнага факультэта БДУ, у 1997–2004 гг. – суддзёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Георгію Аляксандравічу прысвоены вышэйшы кваліфікацыйны клас суддзі і званне заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь. У 1979 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Кантрольныя функцыі Прэзідыума Вярхоўнага Савета саюзнай рэспублікі». Г. А. Варабей з’яўляецца аўтарам звыш 100 навуковых работ.

Неацэнны ўнёсак у развіццё навукі грамадзянскага права зрабіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны В. Ф. Чыгір. Ён узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені (1972), 1-й ступені (1985) і шматлікімі медалямі. Васіль Фёдаравіч у 1949 г. скончыў МЮІ, у 1952 г. – аспірантуру інстытута. У 1970 г. у БДУ ён абараніў доктарскую дысертацыю «Жыллёвыя праваадносіны» у 1973 г. атрымаў навуковае званне прафесара. У 1971–1993 гг. В. Ф. Чыгір працаваў загадчыкам кафедры грамадзянскага і сямейнага (з 1991 г. грамадзянскага) права, у 1973–1983 гг. – дэканам юрыдычнага факультэта БДУ, у 1993–2018 гг. – прафесарам кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ [7, с. 244–245]. В. Ф. Чыгір – аўтар звыш 550 навуковых прац, у тым ліку 20 манаграфій, сярод якіх «Приватизация жилья» (1993), «Юридические лица» (1994), «Кредиты и субсидии на приобретение и оплату жилья» (1996), «Физические и юридические лица как субъекты гражданского права» (2000), «Договор аренды жилого помещения» (2001), «Сроки. Исковая давность» (2005), «Сделки в гражданском праве» (2006), «Юридические лица (коммерческие и некоммерческие организации) Республики Беларусь» (2012) і інш. Яго публікацыі ахопліваюць практычна ўсю праблематыку грамадзянскага права: прававое становішча суб’ектаў грамадзянскага права, здзелкі, іскавую даўнасць, рэчавае права, дагаворнае права, жыллёвае права, права інтэлектуальнай уласнасці і інш. Пад кіраўніцтвам ці з удзелам Васіля Фёдаравіча падрыхтаваны і апублікаваны вядомыя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў па грамадзянскім, сямейным і жыллёвым праве. Прафесар В. Ф. Чыгір з’яўляўся кіраўніком аўтарскага калектыву, аўтарам многіх глаў і адказным рэдактарам

першага ў Беларусі навучальнага дапаможніка «Гражданское право» ў 3 тамах (1975, 1977, 1978), першага падручніка «Гражданское право» ў 2 частках (2000, 2002), падручніка «Гражданское право» ў 3 тамах (2008, 2010, 2011), многіх каментарыяў да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Васіль Фёдаравіч быў членам рабочай групы па падрыхтоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., рабочай групы па падрыхтоўцы праекта Грамадзянскага кодэкса БССР 1964 г., Жыллёвага кодэкса БССР 1983 г., рабочай групы па падрыхтоўцы Мадэльнага грамадзянскага кодэкса (рэкамендацыйнага заканадаўчага акта для краін СНД) і праекта Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. У 1994–1998 гг. ён з'яўляўся старшынёй экспертнага савета па юрыдычных навуках Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Шмат гадоў В. Ф. Чыгір узначальваў савет па абароне доктарскіх дысертацый па юрыдычных навуках пры БДУ. Васіль Фёдаравіч заснаваў навуковую школу прыватнага права, падрыхтаваў 1 доктара і больш за 20 кандыдатаў юрыдычных навук. У 1971 г. В. Ф. Чыгіру было прысвоена званне заслужанага юрыста БССР.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Я. П. Андрэеў узнагароджаны двума ордэнамі і медалямі. У 1958 г. ён скончыў юрыдычны факультэт БДУ. У 1995–2000 гг. Яўгеній Пятровіч працаваў дацэнтам кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. У 1972 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Правараздольнасць і дзеяздольнасць непаўналетніх па савецкім грамадзянскім праве».

Вялікі ўнёсак у станаўленне і развіццё навукі грамадзянскага працэсуальнага права Беларусі зрабілі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, дактары юрыдычных навук, прафесары С. В. Курылёў і М. Р. Юркевіч. С. В. Курылёў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і чатырма медалямі, у тым ліку двума медалямі «За адвагу». Ён займаўся даследаваннем пытанняў тэорыі даказвання і ўстанаўлення ісціны ў савецкім правасуддзі, доказаў у грамадзянскім працэсе і інш. Сяргей Васільевіч з'яўляецца аўтарам звыш 30 навуковых прац. Ён прымаў удзел у рабоце па кадыфікацыі заканадаўства БССР у 1960-я гг., працаваў у складзе рабочай групы па падрыхтоўцы Грамадзянска-працэсуальнага кодэкса БССР 1964 г. С. В. Курылёў з'яўляўся членам Грамадскага савета па прававых пытаннях пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР, членам Навукова-метадычнага савета Вярхоўнага Суда БССР.

Ордэнамі Чырвонага Сцяга (1943) і Вялікай Айчыннай вайны 2-й ступені (1985), юбілейнымі медалямі ўзнагароджаны М. Р. Юркевіч. Скончыўшы МЮІ ў 1950 г., ён амаль усё жыццё працаваў на юрыдычным факультэце БДУ: у 1974–1978 гг. і у 1981–1994 гг. быў загадчыкам кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта БДУ, у 1994–2016 гг. – прафесарам гэтай кафедры. У 1967 г. у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце ён абараніў доктарскую дысертацыю «Шлюб і яго прававое рэгуляванне ў СССР (па матэрыялах Беларускай ССР)». Навуковае званне прафесара Мікалай Рыгоравіч атрымаў у 1970 г. Ён з'яўляецца аўтарам звыш 200 навуковых прац, у тым ліку 7 аднаасобных і 10 калектыўных манаграфій. Пад яго навуковым кіраўніцтвам былі падрыхтаваны больш за 20 кандыдатаў юрыдычных навук.

У перыяд 1994–2005 гг. М. Р. Юркевіч узначальваў Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце. Мікалай Рыгоравіч быў галоўным рэдактарам створанага ім часопіса «Прамыслова-гандлёвае права», уваходзіў у групу па распрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны першапачатковы тэкст праекта Грамадзянска-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г. і праекта Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. № 279-З «Аб міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе». М. Р. Юркевіч быў членам спецыялізаванага Савета НАН Беларусі. У 1996 г. яму было прысвоена званне заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь, у 2004 г. – ганаровага работніка юстыцыі, у 2005 г. – ганаровага работніка гаспадарчага суда. Стварэнне навуковай школы грамадзянскага працэсуальнага права звязана з імем доктара юрыдычных навук, прафесара С. В. Курылёва, а яе станаўленне – з імем доктара юрыдычных навук, прафесара М. Р. Юркевіча.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Г. А. Павецьеў за венныя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі «За абарону Ленінграда» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.». У 1948 г. у Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК УКП(б) ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Прававое рэгуляванне падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў для сацыялістычнай прамысловасці». У 1945–1946 гг. і 1948–1954 гг. Г. А. Павецьеў займаў пасаду дырэктара МЮІ, у 1954–1962 гг. – прарэктара БДУ па навуковай рабоце, у 1950–1971 гг. – загадчыка кафедры грамадзянскага права і працэсу юрыдычнага факультэта БДУ. Гаўрыіл Аляксеевіч быў членам урадавай камісіі па кадыфікацыі заканадаўства, Навукова-метадычнага савета пры Вярхоўным Судзе БССР і Метадычнага савета пры Пракуратуры БССР, Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў школ, ВНУ і навуковых устаноў, рэктарам Грамадскага ўніверсітэта прававых ведаў. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронены шэраг кандыдацкіх дысертацый. Г. А. Павецьеў з'яўляецца аўтарам звыш 25 навуковых прац.

Ля вытокаў навуковай школы крымінальнага права стаялі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны І. І. Гарэлік, І. С. Цішкевіч, В. А. Шкурко. І. І. Гарэлік быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені і медалямі. У 1944 г. ён скончыў Ленінградскі

юрыдычны інстытут, у 1947 г. – аспірантуру гэтай установы. У 1947–1992 гг. працаваў на кафедры крымінальнага права МЮІ, юрыдычнага факультэта БДУ (спачатку дацэнтам, пазней прафесарам). У 1965 г. у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце Іосіф Ісакавіч абараніў доктарскую дысертацыю «Злачынствы, небяспечныя для жыцця і здароўя (пастаўленне ў небяспеку і пакіданне ў небяспецы)». Навуковае званне прафесара ён атрымаў у 1966 г. І. І. Гарэлік падрыхтаваў 3 кандыдатаў юрыдычных навук. Ён з'яўляецца аўтарам звыш 80 навуковых прац, у тым ліку «Квалификация преступлений, опасных для жизни и здоровья» (1973), «Применение уголовного законодательства о судебной практике БССР» (1982), аўтарам і рэдактарам першага тома двухтомнага падручніка «Уголовное право БССР» (1978). Працяглы час Іосіф Ісакавіч быў членам Навукова-кансультатыўнага Савета пры Вярхоўным Судзе БССР, удзельнічаў у падрыхтоўцы праекта Крымінальнага кодэкса БССР 1960 г. Акрамя таго, ён зрабіў унёсак у распрацоўку Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г.

Удзельнік Вялікай айчыннай вайны І. С. Цішкевіч у 1948 г. скончыў МЮІ, у 1951 г. – аспірантуру інстытута, пасля таго прайшоў усе этапы выкладчыцкай кар'еры. У 1965–1988 гг. ён працаваў загадчыкам кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ, некалькі гадоў выконваў абавязкі дэкана юрыдычнага факультэта БДУ. У 1969 г. у БДУ Іван Станіслававіч абараніў доктарскую дысертацыю «Абарона ад грамадска небяспечнага замаху і меры па затрыманні злачынца». Навуковае званне прафесара ён атрымаў у 1971 г. І. С. Цішкевіч падрыхтаваў 6 кандыдатаў юрыдычных навук [7, с. 238–239]. Ён з'яўляецца аўтарам звыш 120 навуковых прац, у тым ліку «Приготовление и покушение по советскому уголовному праву» (1958), «Условия и пределы необходимой обороны» (1969), «Квалификация хищения имущества» (1996) і інш. Іван Станіслававіч удзельнічаў у выданні вучэбных дапаможнікаў па крымінальным праве (1997), падрыхтоўцы праекта Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 г. Шмат гадоў ён з'яўляўся членам Навукова-кансультатыўнага Савета пры Вярхоўным Судзе БССР. І. С. Цішкевічу прысвоена званне заслужанага юрыста БССР.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны В. А. Шкурко ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, некалькімі медалямі. З 1962 г. ён працаваў дацэнтам кафедры крымінальнага права і працэсу юрыдычнага факультэта БДУ. У 1965–1972 гг. Васіль Адамавіч займаў пасаду дэкана юрыдычнага факультэта БДУ. У наступныя гады працаваў дацэнтам, прафесарам кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ. У 1953 г. у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Барацьба са службовай нядбайнасцю па савецкім крымінальным праве». В. А. Шкурко падрыхтаваў 3 кандыдатаў юрыдычных навук. Васіль Адамавіч – аўтар звыш 60 навуковых прац, у тым ліку 7 манаграфій, 12 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, аўтар некалькіх выданняў навукова-практычных каментарыяў да Крымінальнага кодэкса БССР 1960 г. [7, с. 249–250].

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны В. С. Швяцоў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. У 1967 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па праблемах прававога рэгулявання пакарання ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён. З 1972 г. В. С. Швяцоў працаваў дацэнтам кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ [7, с. 249].

Значны ўнёсак у развіццё навукі крымінальнага права зрабіла ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны К. В. Кічыгіна. Яна ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені і медалямі. Кацярына Васільеўна ў 1949 г. скончыла юрыдычны інстытут у Свярдлоўску, у 1961 г. – аспірантуру Інстытута дзяржавы і права Акадэміі навук БССР. Там жа ў 1961 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю «Крымінальная адказнасць за парушэнне правіл бяспекі руху і эксплуатацыі аўтамотатранспарту або гарадскога электратранспарту». У 1961–1993 гг. Кацярына Васільеўна працавала дацэнтам на кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ. К. В. Кічыгіна – аўтар звыш 30 навуковых прац [7, с. 171–172].

На кафедры крымінальнага права МЮІ працаваў выпускнік факультэта права і гаспадаркі БДУ 1929 г., інвалід Вялікай Айчыннай вайны В. К. Пракудовіч, які займаў высокія дзяржаўныя пасады: намесніка Пракурора БССР, Народнага камісара юстыцыі БССР, Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Ён зрабіў значны ўнёсак у развіццё навукі крымінальнага права.

Старшым выкладчыкам кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ працавала В. Л. Пруднічэнка, партызанка атрада імя П. Е. Казанакова.

На развіццё навукі крымінальнага працэсу значна паўплывалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны С. П. Бякешка, М. М. Гапановіч, Я. А. Мацвіенка, Я. Ф. Плюта. С. П. Бякешка ў 1950 г. скончыў МЮІ. У 1955 г. у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Абарона ў стадыі судовага разбіральніцтва ў савецкім крымінальным працэсе». Доўгі час С. П. Бякешка працаваў дацэнтам кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ, у 1969–1974 гг. займаў пасаду загадчыка кафедры крымінальнага працэсу, намесніка дэкана юрыдычнага факультэта БДУ.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны М. М. Гапановіч адзначаны 6 дзяржаўнымі ўзнагародамі СССР. У 1949 г. ён скончыў МЮІ, у 1960 г. – аспірантуру

Інстытута дзяржавы і права Акадэміі навук БССР, абараніў кандыдацкую дысертацыю па крымінальным працэсе. З 1964 г. Мікалай Мікалаевіч працаваў дацэнтам кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі (у 1972–1979 гг. кафедры крыміналістыкі) юрыдычнага факультэта БДУ. Ён з'яўляецца аўтарам шэрагу навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфій і 2 вучэбных дапаможнікаў. Без адрыву ад вучэбнага працэсу падрыхтаваў доктарскую дысертацыю «Выкарыстанне ў крымінальным судаводстве апазнавальнай здольнасці чалавека», аднак трагічная смерць не дазволіла таленавітаму вучонаму і педагогу абараніць яе.

Яшчэ адзін таленавіты вучоны – Я. А. Мацвіенка – у 1951–1954 гг. працаваў выкладчыкам МЮІ, у 1954–1988 гг. – дацэнтам, загадчыкам кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта БДУ. У 1951 г. у Інстытуце права Акадэміі навук СССР ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Судовае следства ў крымінальным працэсе». У 1953 Яўгеній Аляксандравіч атрымаў вучонае званне дацэнта, у 1978 г. – вучонае званне прафесара. Ён з'яўляецца аўтарам 60 навуковых прац.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны, дванаццаццю медалямі Я. Ф. Плюта ў 1937 г. скончыў Харкаўскі юрыдычны інстытут. У 1960–1985 гг. ён працаваў выкладчыкам, дацэнтам кафедры крымінальнага працэсу юрыдычнага факультэта БДУ.

Неацэнны ўнёсак у развіццё крыміналістыкі Беларусі зрабіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны А. В. Дулаў, які быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, медалямі СССР. У 1951 г. ён скончыў юрыдычны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1958–2017 гг. Андрэй Васільевіч працаваў дацэнтам, прафесарам кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ, а ў 1972–1990 г. – загадчыкам гэтай кафедры. А. В. Дулаў займаўся шматлікімі праблемнымі аспектамі крыміналістыкі, у тым ліку тэарэтычнымі пытаннямі судовай экспертызы, папярэдняга следства, судовай псіхалогіі, судовай этыкі і інш. Ён з'яўляецца аўтарам каля 600 навуковых прац, у тым ліку кніг «Судебная психология» (1970, 1975), «Психологический анализ на предварительном следствии» (1973), «Тактические операции при расследовании преступлений» (1979), якія выкарыстоўваліся ва ўсіх юрыдычных установах вышэйшай адукацыі СССР. У 2005 г. была надрукавана манаграфія «Основы формирования теории криминалистического доказывания», якую А. В. Дулаў напісаў сумесна з А. С. Рубісам. Андрэй Васільевіч падрыхтаваў звыш 50 кандыдатаў і дактароў юрыдычных навук. Навуковец узнагароджаны ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Ён з'яўляецца лаўрэатам прэміі імя У. І. Пічэты, мае званне заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь.

На кафедры крыміналістыкі доўгі час працавала і спрыяла яе развіццю І. А. Матусевіч, якая за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне была ўзнагароджана медалямі. У гады вайны яна з'яўлялася сувязной партызанскага атрада «Беларусь». У 1950 г. Ірына Антонаўна скончыла МЮІ, у 1963–1995 гг. працавала выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры крымінальнага працэсу і крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ (з 1972 г. кафедры крыміналістыкі). У 1968 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю «Вывучэнне асобы абвінавачваемага ў працэсе папярэдняга расследавання злачынстваў». І. А. Матусевіч – аўтар каля 30 навуковых прац.

## Заключэнне

Студэнты, выпускнікі, выкладчыкі МЮІ з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны сталі актыўнымі ўдзельнікамі баявых дзеянняў і партызанскага руху. Сваімі дзеяннямі яны набліжалі перамогу, якая стала магчымай толькі дзякуючы подзвігу ўсяго шматнацыянальнага савецкага народа. Мы павінны захоўваць памяць пра яго! Павінны выхоўваць моладзь, студэнтаў юрыдычнага факультэта БДУ на прыкладах подзвігаў студэнтаў, выпускнікоў, выкладчыкаў МЮІ, многія з якіх пасля заканчэння вайны сталі знакамітымі навукоўцамі, займалі высокія дзяржаўныя пасады, чым аказалі істотны ўплыў на станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў пасляваенны перыяд, а таксама юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі.

Заснавальнікамі юрыдычных навуковых школ сталі І. А. Юхо, С. Р. Драбязка, А. А. Галаўко, А. Ц. Лейзераў, Я. М. Тагуноў і Г. А. Варабей, В. Ф. Чыгір, С. В. Курылёў, М. Р. Юркевіч, І. І. Гарэлік, І. С. Цішкевіч, В. А. Шкурко, А. В. Дулаў і інш.

Усе яны з'яўляліся членамі саветаў па абароне дысертацый, былі экспертамі і апанентамі на абаронах дысертацый, актыўна займаліся падрыхтоўкай маладых вучоных-юрыстаў. Пры іх навуковым кансультаванні і кіраўніцтве былі абаронены шматлікія кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны зрабілі вялікі ўнёсак не толькі ў юрыдычную навуку і адукацыю, але і ў правапрымяняльную практыку, у тым ліку ў працэс кадыфікацыі заканадаўства ў 1960-я гг. і 1990-я гг., ва ўдасканаленне дзейнасці дзяржаўнага апарату, распрацоўку новых форм і сродкаў забеспячэння законнасці як неабходнай умовы фарміравання прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці.

Подзвіг студэнтаў, выпускнікоў, выкладчыкаў МЮІ, іх навуковая і дзяржаўная дзейнасць у пасляваенны перыяд з'яўляюцца прыкладам для наступных пакаленняў юрыстаў. Памяць пра гэтых асоб ушанавана ў музеі юрыдычнага факультэта БДУ, у іх гонар рэгулярна праводзяцца міжнародныя навукова-

практычныя канферэнцыі. Так, адбыліся канферэнцыі, прысвечаныя юбілейным датам або памяці прафесараў С. Р. Драбязкі, А. В. Дулава, В. Ф. Чыгіра, С. В. Курылёва, І. С. Цішкевіча, М. Р. Юркевіча, І. А. Юхо. Апошняя з іх, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння доктара юрыдычных навук, прафесара, заслужанага юрыста БССР В. Ф. Чыгіра адбылася ў верасні 2024 г., яшчэ пры жыцці прафесара.

У рамках праекта «Наследие права» выдадзены навуковыя працы прафесараў А. А. Галаўко [8], І. І. Гарэліка [9], С. Р. Драбязкі [10], А. В. Дулава [11], С. В. Курылёва [12], І. С. Цішкевіча [13], В. Ф. Чыгіра [14], М. Р. Юркевіча [15].

У далейшым у парадку пераемнасці для развіцця юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці калектыў юрыдычнага факультэта БДУ будзе абапірацца на навуковыя ідэі, традыцыі, якія заклалі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, дактары і кандыдаты юрыдычных навук, прафесары, дацэнты.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Максимова ЛП. *Огненный выпуск. Факты. Документы.* Минск: Издательский центр БГУ; 2010. 159 с.
2. Максимова ЛП. *Юридический факультет Белорусского государственного университета: история и современность.* Минск: БГУ; 1998. 224 с.
3. Шыдлоўскі АВ, Доўнар ТІ, Голубева ЛЛ, Міхалёва ТМ, Пухаў АА. Юрыдычны факультэт: высокая запатрабаванасць дзяржавай і грамадствам. У: Кароль АД, рэдактар. *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: нарысы гісторыі і сучасны стан.* Мінск: БДУ; 2021. с. 57–74.
4. Максимова ЛП. *Alma mater юристов Беларуси: история и современность юридического факультета Белорусского государственного университета.* Минск: Право и экономика; 2001. 171 с.
5. Балашенко СА, Василевич ГА, Довнар ТИ. История становления и развития правовой науки и юридических научных школ Беларуси. В: Абламейко СВ, Зеленкова АИ, редакторы. *Научные школы БГУ в воспоминаниях и размышлениях профессоров.* Минск: БГУ; 2023. с. 185–204.
6. Величко В. *Профессора, наденьте ордена!* Минск: БГУ; 2011. 43 с.
7. Балашэнка СА, рэдактар. *Юрыдычны факультэт. Гісторыя. Сучаснасць. Імёны.* Мінск: БДУ; 2015. 263 с.
8. Головко АА. *Избранные труды.* Минск: ЮрСпектр; 2018. 496 с. (Наследие права).
9. Горелик ИИ. *Избранные труды.* Минск: ЮрСпектр; 2021. 480 с. (Наследие права).
10. Дробязко СГ. *Избранные труды.* Минск: ЮрСпектр; 2022. 656 с. (Наследие права).
11. Дулов АВ. *Избранные труды.* Минск: ЮрСпектр; 2024. 520 с. (Наследие права).
12. Курылев СВ. *Избранные труды.* Минск: Редакция журнала «Промышленно-торговое право»; 2012. 607 с. (Наследие права).
13. Тишкевич ИС. *Избранные труды.* Минск: Редакция журнала «Промышленно-торговое право»; 2014. 484 с. (Наследие права).
14. Чигир ВФ. *Избранные труды.* Минск: Редакция журнала «Промышленно-торговое право»; 2014. 560 с. (Наследие права).
15. Юркевич НГ. *Избранные труды.* Минск: Редакция журнала «Промышленно-торговое право»; 2015. 592 с. (Наследие права).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 31.07.2025.*
*Received by editorial board 31.07.2025.*